# ГІСТОРЫЯ

УДК 947.07(476)

*А. П. Жытко*

## Развіццё авечкагадоўлі ў дваранска-памешчыцкай гаспадарцы Беларусі. 1861—1914 гады

Авечкагадоўля мела важнае значэнне ў жывёлагадоўлі Беларусі. На тэрыторыі края разводзіліся як мерыносавыя авечкі ў дваран-памешчыкаў, за выключэннем Слонімскага павета, дзе ў сялян іх налічвалася 520 штук [1, с. 108], так і непародзістыя, грубашэрсныя ў сялянскіх і памешчыцкіх гаспадарках.

У Беларусі сялянская грубашэрсная авечкагадоўля насіла спажывецкі характар, задавальняючы патрэбы сялян у прадуктах харчавання, сыравіне для адзення. Памешчыцкая грубашэрсная, асабліва танкарунная, авечкагадоўля была гандлёва-прадпрымальніцкай галіной гаспадаркі.

Аб дынаміцы развіцця авечкагадоўлі ў заходнім краі сведчать даныя табліцы. У 1856—1911 гг. колькасць авечак павялічылася з 1465,7 да 2563,1 тыс. галоў (у 1,7 раза). Найбольшы прырост адбыўся ў Віцебскай, а найменшы — у Гродзенскай і Магілёўскай губернях (у 1,5 раза). Гэта тлумачыцца тым, што ў 1856 г. у Віцебскай губерні зафіксаваны мінімальны лік авечак у параўнанні з іншымі.

Развіццё авечкагадоўлі адбывалася нераўнамерна. Варта звярнуць увагу на скарачэнне колькасці авечак за 1864—1870 гг., якое склала 93,6 тыс. штук. Пры гэтым значна паменшыўся мерыносавы статак. Хаця колькасць грубашэрсных авечак павялічылася, але тэмпы прыросту былі нязначнымі. Прычыну такой з'явы В. П. Панюціч звязвае з вынікамі рэформы 1861 г. Зразумела, што цяжкія ўмовы, у якіх праходзіла перабудова памешчыцкай гаспадаркі, аказалі негатыўны ўплыў на яе развіццё і патрабавалі ад дваран пэўных выдаткаў. Але, на наш погляд, больш правільныя высновы зрабіла Валуеўская камісія, у дакладзе якой у 1872 г. прама адзначалася, што «авечкагадоўля... пасля 1863 г. стала мізэрнай. Авечкі, як і іншая жывёла, пайшлі пад нож для выплаты першага збору з памешчыцкіх маёнткаў» [2, с. 128]. Уласнікамі ж мерыносаў былі выключна дваране-памешчыкі. Калі за гэтыя гады статак

танкарунных авечак зменшыўся амаль у два разы, то на продаж ішлі ў першую чаргу, відаць, грубашэрсныя авечкі і ў крайнім выпадку — мерыносавыя.

Сяляне ж кантрыбуцыі не плацілі. Можна меркаваць, што колькасць грубашэрсных памешчыцкіх авечак зменшылася на большую лічбу, чым танкарунных. Іх нязначнае агульнае павелічэнне адбылося за кошт сялянскіх. На жаль, гэта толькі меркаванне, таму што ў афіцыйнай статыстыцы да 1878 г. не было падзелу авечак на ўласніцкія і сялянскія.

У наступныя гады прырост адбываўся толькі за кошт грубашэрсных авечак. Падкрэслім, што, акрамя мерыносавых і простых авечак, некаторыя ўласнікі зрэдку разводзілі і авечак мясных парод — метысаў мясных авечак з мерыносамі. Статкі іх былі невялікімі і складаліся звычайна з 50—100 галоў. Чыстакроўныя мясныя авечкі былі зафіксаваны ў 3 маёнтках Мінскага павета — Крацяніца, Стары Свержань і Трусінава [1, с. 14, 18].

Грубашэрсныя авечкі былі распаўсюджаны амаль на ўсёй тэрыторыі Беларусі, а мерыносавыя сустракаліся нават не ва ўсіх паветах. Танкарунная авечкагадоўля атрымала развіццё ў асноўным у беларускіх паветах Гродзенскай губерні. У 1880 г. на іх долю прыпадала 76,2% мерыносаў губерні, а гэта складала 52,8% ад колькасці ўсіх авечак, што расплоджваюцца на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Другое месца ў мерыносавай авечкагадоўлі займала Мінская губерня — 74,0 тыс. галоў (40,3%). У беларускіх паветах Віленскай, Віцебскай і Магілёўскай губерняў налічвалася толькі 12,7 тыс. мерыносаў (6,9%) [1, с. 106—110].

У асобных уладальніцкіх маёнтках танкарунная авечкагадоўля была буйной сельскагаспадарчай галіной. Звычайна ў іх утрымлівалася ад 300 да некалькіх тысяч авечак. У другой палове XIX ст. статкі менш чым у 300 галоў сустракаліся вельмі рэдка, паколькі ў такіх выпадках значна ўзрасталі выдаткі на іх утрыманне. Паводле падлікаў В. П. Панючыца, у першай палове 60-х гадоў з 22 абследаваных эканомій Беларусі, дзе ўтрымлівалі мерыносаў, у 12 з іх налічвалася звыш 1 тыс. галоў, у 9 — ад 300 да 1 тыс. У канцы 90-х гадоў з 25 уладальніцкіх мерыносаавечкагадоўчых гаспадарак края ў 11 было звыш 1 тыс. авечак, у 12 — ад 300 да 1 тыс., і ў 2 — да 300 [3, с. 101]. Найбольш вядомымі і буйнымі эканоміямі на Беларусі, дзе вырошчваліся мерыносавыя авечкі, былі маёнткі Свіслач графа Пуслоўскага Гродзенскага, Шчорсы графа Храптовіча Навагрудскага, Парэчча Скірмунта Пінскага паветаў [4, с. 91—92].

*Табліца*

**Дынаміка колькасці авечак у 5 заходніх губернях (тыс. штук)**[1]

| Гады | Губерні | | | | | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Віленская | | | Віцебская | | | Гродзенская | | | Мінская | | | Магілёўская | | | УСЯГО | | |
| | груба-шэрсныя | меры-носавыя | разам | груба-шэрсныя | меры-носавыя | разам | груба-шэрсныя | меры-носавыя | разам | груба-шэрсныя | меры-носавыя | разам | груба-шэрсныя | меры-носавыя | разам | груба-шэрсныя | меры-носавыя | разам |
| 1856 | 168,4 | 36,4 | 204,8 | 172,2 | 0,8 | 173,0 | 234,0 | 168,9 | 402,9 | 253,1 | 139,5 | 392,6 | 290,2 | — | 290,2 | 1117,9 | 347,8 | 1465,7 |
| 1864 | 180,0 | 40,0 | 220,0 | 280,0 | — | 280,0 | 332,0 | 220,0 | 552,0 | 320,0 | 155,0 | 475,0 | 344,0 | 34,0 | 378,0 | 1456,0 | 449,0 | 1905,0 |
| 1870 | 215,5 | 11,0 | 226,5 | 288,2 | 2,2 | 290,4 | 378,6 | 126,3 | 504,9 | 365,6 | 96,6 | 462,2 | 319,2 | 8,2 | 327,4 | 1567,1 | 244,3 | 1811,4 |
| 1880* | 287,4 | 6,6 | 293,0 | 268,7 | 1,4 | 270,1 | 436,9 | 126,9 | 563,8 | 473,0 | 74,0 | 547,0 | 353,9 | 5,1 | 359,0 | 1819,9 | 214,0 | 2033,9 |
| 1910** | 362,6 | 7,6 | 370,2 | 402,1 | 9,7 | 411,8 | 540,9 | 73,1 | 614,0 | 763,7 | 27,6 | 791,3 | 442,6 | 0,3 | 442,9 | 2511,6 | 118,3 | 2629,9 |
| 1911 | 396,1 | 6,3 | 402,4 | 398,4 | 10,2 | 408,6 | 532,1 | 73,7 | 605,8 | 687,2 | 12,5 | 699,7 | 446,2 | 0,4 | 446,6 | 2460,0 | 103,1 | 2563,1 |

* Перапіс праводзіўся: у 1878 г. — у Магілёўскай губерні, у 1879 — у Віцебскай і Гродзенскай, у 1880 — Віленскай і Мінскай губернях.

** Больш адпавядаюць сапраўднасці лічбы: грубашэрсных — 586,7 тыс., мерыносавых — 14,7 тыс. штук, што зафіксаваны ў «Памятнай кніжцы Мінскай губерні на 1912» (1910 г.)

---

1 Статистические таблицы Российской империи за 1856 г. СПб., 1858. С. 11, 13, 35, 69, 71; Статистический временник Российской империи. СПб., 1866. Отд. II. С. 242—243; Статистический временник Российской империи. Сер. II. Вып. X. СПб., 1875. С. 70—72, 75—76; Исследования современного состояния овцеводства в России. Вып. VI. Овцеводство в северо-западных и юго-западных губерниях. СПб., 1885. С. 106—110; Сборник статистико-экономических сведений по сельскому хозяйству России и иностранных государств. Вып. 6. СПб., 1913. С. 235, 236; Отчет по ветеринарной части в России за 1911 г. СПб, 1914. Прил. С. 12.

Хаця гэтыя мерыносавыя «заводы» захаваліся і на пачатку XX ст., але роля танкарунннай авечкагадоўлі няўхільна паніжалася. Пра гэта сведчыць і агульнае скарачэнне колькасці мерыносаў (як адлюстравана ў табліцы: з 449,0 тыс. у 1864 г. да 103,1 тыс. у 1911 г., ці ў 4,4 раза), і паяўленне шэрага маёнткаў, дзе іх утрымлівалася толькі па некалькі дзесяткаў. Так, у 1912 г. у Дзісненскім павеце было 16 экономій, дзе налічвалася 176 авечак (у сярэднім 11 на адну), Лідскім — 4 экономіі і 132 авечкі (38 на адну) і толькі ў Ашмянскім павеце Віленскай губерні ў маёнтку Вішнёва графа Храптовіча ў статку мерыносаў налічвалася 1245 авечак [5, с. 19]. Да пачатку Першай сусветнай вайны колькасць танкарунных авечак пачала рэзка памяншацца. Калі ў 1911 г. у Гродзенскай губерні налічвалася 73,7, то ў 1913 г. — толькі 22,2 тыс. мерыносаў. У Мінскай губерні колькасць мерыносаў склала 6,3 тыс. у 1913 г. у параўнанні з 27,6 тыс. у 1910 г. [6]. Адказ памешчыкаў ад гэтай галіны жывёлагадоўлі быў выкліканы эканамічнай немэтазгоднасцю. Па-першае, узмацнілася канкурэнцыя як на сусветным, так і на расійскім рынку на танкарунную воўну, па-другое, буйнарагатая жывёлагадоўля з яе малочнай накіраванасцю і свінагадоўля сталі больш выгаднымі галінамі прыкладання капіталу.

У Беларусі ва ўласніцкіх гаспадарках пераважна разводзілі дробныя і сярэднія пароды танкарунных авечак — электральнегрэці і негрэці-рамбульє. На працягу сезона можна было атрымаць па 1—1,5 кг воўны з авечкі. У 1861 г. у беларускіх паветах было атрымана 28 тыс. пудоў танкарунннай воўны коштам звыш 500 тыс. руб., у 1901 — 8 тыс. пудоў на 150 тыс. руб. [3, с. 102]. На буйных авечкагадоўчых комплексах, дзе была наладжана якасная стрыжка і апрацоўка воўны, яе кошт быў вышэйшы за сярэдні. Так, памешчыкі Мінскага павета выручалі за пуд па 16—18 руб. [7], а воўна з маёнтка Вішнёва графа Храптовіча, дзе ў 1911 г. утрымлівалася 1710 мерыносаў, ішла па 20—28 руб. за пуд [5, с. 19].

Памешчыкі Беларусі разводзілі і простых грубашэрсных авечак, асабліва ў тых рэгіёнах, дзе было шмат выганаў, забалочаных земляў. Гэта тычыцца Магілёўскай і беларускіх паветаў Віленскай і Віцебскай губерняў. Так, на рубяжы 70—80-х гадоў у беларускіх паветах Віленскай губерні на долю памешчыкаў прыпадала 26,1% грубашэрсных авечак, а ў Гродзенскай і Мінскай губернях адпаведна 13,5 і 3,3% [1, с. 106, 110].

У 1900 г. прыватнікі 35 беларускіх паветаў утрымлівалі 19,8% статка авечак і коз з агульнай колькасцю 2533, 4 тыс. галоў [8, с. 7—9, 12]. Калі ўлічыць, што коз разводзілі ў

асноўным сяляне і мяшчане, то ўключэнне коз у агульную лічбу грунтоўна не ўплывае на канчатковыя вынікі. На жаль, у наступныя гады ў афіцыйнай статыстыцы не даецца падзелу авечак на сялянскія і прыватнаўласніцкія. Калі экстрапаліраваць атрыманы працэнт за 1900 г. на 1911 г., то на долю памешчыкаў ды іншых прыватнікаў 5 заходніх губерняў прыходзілася 103,1 тыс. мерыносаў і 487,1 тыс. грубашэрсных авечак (гл. табл.).

На Беларусі, як і ў Еўрапейскай частцы Расіі, у авечкагадоўлі наглядаліся аднолькавыя працэсы. Абсалютная і адносная колькасць мерыносаў скарачалася, а грубашэрсных авечак павялічвалася. З 1864 да 1911 г. статак мерыносаў у 5 заходніх губернях скараціўся ў 4,4, а ў 50 губернях імперыі — у 5,2 раза (з 11655 тыс. да 2235 тыс.) [9, с. 22—23]. Разам з тым агульны абсалютны рост статка авечак не адлюстроўвае рэальнай карціны становішча дадзенай галіны жывёлагадоўлі і па Беларусі, і па імперыі ў цэлым. Так, рост пагалоўя авечак у парэформенныя гады адставаў ад росту насельніцтва. Калі ў 1856 г. у 5 заходніх губернях на 100 жыхароў прыходзілася 33,9 авечкі, то ў 1911 — 23,9. Памяншэнне склала 21,1%. У Еўрапейскай Расіі гэтыя паказчыкі знізіліся адпаведна з 72,0 да 34,5, памяншэнне — 52,1%. Калі ўлічыць, што на Беларусі ў парэформенныя гады адбываўся дэмаграфічны выбух у асноўным за кошт павятовага насельніцтва і шчыльнасць насельніцтва 5 заходніх губерняў была ў 1,7 раза большай, чым у Еўрапейскай Расіі (32,3 чал./км$^2$ у параўнанні з 19,3 чал./км$^2$) [10], то страты беларускай авечкагадоўлі ў разліку на колькасць жыхароў былі значна меншымі, чым у 50 губернях імперыі. Пры гэтым сялянская авечкагадоўля (за выключэннем заможнай часткі) станавілася больш спажывецкай, а дваранска-памешчыцкая — гандлёва-прадпрымальніцкай.

### *ЛІТАРАТУРА, КРЫНІЦЫ*

1. Исследование современного состояния овцеводства в России. СПб., 1885. Вып. 6.

2. Доклад... комиссии... СПб., 1873. Приложение. Отд. II.

3. *Панюціч В. П.* Танкарунная авечкагадоўля ў памешчыцкай гаспадарцы Беларусі ў другой палове XIX ст. (1861—1900 гг.) //Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1975. № 5.

4. Памятная книжка Виленской губернии на 1895 год. Вильна, 1894.

5. Обзор Виленской губернии за 1912 год. Вильна, 1913.

6. Сборник статистико-экономических сведений по сельскому хозяйству России и иностранных государств. СПб., 1913.

Вып. 6. С. 236; Памятная книжка Минской губернии на 1915 год. Мн., 1914. Отд. IV. С. 76.

7. НГА РБ. Ф. 21. Воп. I. Спр. 111. Ч. 2. Л. 519.

8. Сведения о количестве скота в 1900 г. по данным волостных правлений и уездной полиции. СПб., 1901.

9. Материалы к пересмотру торгового договора с Германией. СПб., 1912. Вып. IV.

10. Статистические таблицы Российской империи за 1856 год. СПб., 1858. С. 11, 13, 35, 69, 71; Отчет по ветеринарной части в России за 1911 год. СПб, 1914. Приложение. С. 14.

*SUMMARY*

*The article is dedicated to developing of sheep-breeding of nobility in the period of capitalism. It is shown in article the gradually turning of sheep-breeding from consumer to trade branch.*

УДК 947.0857(476)

*М. М. Забаўскі*

# Сацыял-дэмакратычныя і народніцкія партыі і групоўкі на выбарах у III Дзяржаўную думу Расіі (1907 г.)

Некаторыя аспекты вылучанай тэмы разглядаюцца ў працы А. І. Брыгадзіна [1], манаграфіях А. С. Караля [2] і В. І. Салашэнкі [3]. Ход выбарчай кампаніі ў III Думу ў 5 заходніх губернях і пазіцыі дэпутатаў ад Беларусі аналізуе М. В. Біч [4].

У прапануемым артыкуле ставіцца мэта на падставе архіўных матэрыялаў, першакрыніц, перыядычных выданняў больш грунтоўна раскрыць пытанні ўдзелу ў выбарчай кампаніі 1907 г. сацыял-дэмакратычных і народніцкіх партый і груповак у Беларусі, вызначыць спецыфіку іх дзейнасці ў краі.

Скліканая 21—23 чэрвеня 1907 г. для абмеркавання тактычных пытанняў у сувязі з трэцячэрвеньскім пераваротам і выбарамі ў III Дзяржаўную думу, III канферэнцыя РСДРП (Другая Агульнарасійская) канчаткова вызначыла тактыку бальшавікоў у перыяд выбараў.

Па пытанню магчымых выбарчых блокаў III канферэнцыя РСДРП указала, што «пры пагадненнях» аб блоках сацыял-дэмакраты павінны кіравацца адносінамі да партыі па ступені іх дэмакратызму ў наступнай паслядоўнасці: 1) сацыялісты-рэвалюцыянеры, 2) народныя сацыялісты, 3) трудавікі, 4) кадэты.